Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

29 лютага 2012 года, № 4 (2063)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Нанакааперацыя з Японіяй

***Дамова аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі, навукі і тэхналогій паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам, сумесным беларуска-японскім прадпрыемствам «ЛОТІС ТІІ» і кампаніяй Tokyo Instruments, Inc. падпісана 21 лютага ў БДУ.***

Подпісы пад гэтым дакументам паставілі рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, дырэктар «ЛОТІС ТІІ» Уладзімір Конанаў і прэзідэнт Tokyo Instruments, Inc. Шоджы Сурyга (Shoji Suruga).

Дадзеная дамова накіравана на развіццё сумесных навуковых даследаванняў і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў у галіне нанапамерных сістэм, нанаматэрыялаў, нана- і біятэхналогій.

Варта адзначыць, што прадпрыемства «ЛОТІС ТІІ» і кампанія Tokyo Instruments, Inc. вядомыя ў свеце сумеснымі распрацоўкамі сучаснага навуковага абсталявання. Напрыклад, адно з іх – унікальны спектральна-аналітычны комплекс, які дазваляе ажыццяўляць спектральны рамануўскі і люмінесцэнтны аналіз нана- і мікрапамерных структур, – БДУ набыў у мінулым годзе.



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*Прэзідэнт Tokyo Instruments, Inc. Шоджы Сурyга, рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка і дырэктар СП «ЛОТІС ТІІ» Уладзімір Конанаў*

Каардынацыяй падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і правядзення навуковых даследаванняў у галіне нанаматэрыялаў, нана-і біятэхналогій будзе займацца нядаўна створаны ў БДУ вучэбна-навуковы цэнтр па нанаматэрыялах і нанатэхналогіях.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

СВЯТЫ




*Удзельнікі сустрэчы: С. Вількоўскі, М. Раманаў і М. Сурмач*

***У Дзень абаронцы Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь 23 лютага кіраўніцтва БДУ сустрэлася з ветэранамі Узброеных Сіл нашай краіны, воінамі-інтэрнацыяналістамі – супрацоўнікамі ўніверсітэта.***

На сустрэчу прыйшлі больш за 60 чалавек. Іх вітаў рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў па г. Мінску генерал-маёр Анатоль Адоньеў, начальнік упраўлення інфармацыі Міністэрства абароны палкоўнік Уладзімір Макараў і дырэктар УА РУП «Шчомыслiца» БДУ воін-інтэрнацыяналіст Сяргей Чайкун.

Перад ветэранамі выступілі з канцэртам калектывы БДУ. Завяршылася мерапрыемства ўскладаннем кветак да помніка студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам БДУ, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Паводле інфармацыі УВРМ**

З НАГОДЫ

## Што значыць быць абаронцам Айчыны?

***Дзень абаронцы Айчыны адзначаецца 23 лютага ў многіх краінах СНД. З 1922 г. у СССР ён насіў назву «Дзень Савецкай Арміі і ваенна-марскога флоту». Існуе меркаванне, што гэта мужчынскае свята, аднак у гісторыі нашай краіны шматлікія подзвігі здзяйсняліся менавіта жанчынамі. Таму яго з поўным правам могуць лічыць сваім і многія дзяўчаты, асабліва тыя, якія маюць дачыненне да Узброеных Сіл.***

16 лютага БРСМ ініцыяваў круглы стол па тэме: «Што сёння значыць быць абаронцам Айчыны?». У абмеркаванні прынялі ўдзел прадстаўнікі моладзевага палітычнага клуба БРСМ БДУ, курсанты ваеннага факультэта, а таксама ўдзельнікі баявых дзеянняў у Афганістане: дырэктар УП «Шчомыслiца» БДУ Сяргей Чайкун, адказны сакратар савета ветэранаў БДУ, старшыня афганскай арганізацыі Ленінскага раёна г. Мінска Уладзімір Панфілаў і старшы выкладчык агульнавайсковай кафедры ваеннага факультэта БДУ падпалкоўнік Юрый Тарадзейка.

Падчас гутаркі, акрамя займальных апавяданняў гасцей пра сваю біяграфію, былі агучаны і пытанні: «Ці варта сёння маладым людзям служыць ва Узброеных Сілах?», «Што можа служыць матывацыяй для гэтага?», «Як выхоўваць сучасную моладзь?» і інш. Сутнасць выказаў Сяргей Анатольевіч Чайкун: «Самае галоўнае – гэта заўсёды заставацца чалавекам і патрыётам. І калі малады чалавек сумняваецца, пайсці яму служыць у войска ці не, то наўрад ці ён можа стаць абаронцам Айчыны».

Па выніках круглага стала сакратар БРСМ БДУ Сяргей Клішэвіч уручыў гасцям сувеніры, павіншаваў усіх прысутных са святам і пажадаў моцнага здароўя, удачы ва ўсіх пачынаннях і, вядома ж, мужнасці.

**Ніна КАЛІТА,**
**намеснік сакратара БРСМ БДУ**

Чытайце ў нумары:

НЕАЦЭННЫ СКАРБ НАРОДА
Міжнародны дзень роднай мовы адзначылі ў БДУ з асаблівым размахам
Стар. 2

НА ПАРОЗЕ НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ
Вучэбна-навуковы цэнтр па нанаматэрыялах і нанатэхналогіях з'явіўся ў БДУ
Стар. 3

«ЗІМОВАЯ ШКОЛА» ДЛЯ ГАРАЧЫХ СЭРЦАЎ
Каля 150 студэнтаў з 39 ВНУ абменьваліся вопытам і бралі ўрокі майстэрства ў масцітых выкладчыкаў
Стар. 4

## Весткі з рэктарата

ПАГАДНЕННЕ аб акадэмічных абменах паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Універсітэтам горада Фукусіма (Японія) падпісана 24 лютага. Яно прадугледжвае ажыццяўленне сумесных адукацыйных і навукова-даследчых праграм і праектаў, абмен студэнтамі і выкладчыкамі, навучальнай, метадычнай і навуковай літаратурай, арганізацыю сумесных семінараў і канферэнцый.

* * *

ІМЁНЫ 64 чалавек занесены на Дошку гонару БДУ па выніках 2011 года. З іх 32 работнікі ўніверсітэта ганараваны за заслугі і дасягненні ў адукацыйнай, навуковай, метадычнай, інавацыйнай і кіраўніцкай дзейнасці, а 32 навучэнцы – за высокія вынікі ў вучобе, навуковыя і спартыўныя дасягненні, мастацкую творчасць, актыўны ўдзел у навуковых канферэнцыях і праграмах, алімпіядным і конкурсным руху, а таксама грамадскім жыцці ўніверсітэта, горада і краіны.

Фотагалерэі найлепшых работнікаў і навучэнцаў нашай ВНУ размешчаны на сайце *www.bsu.by* ў раздзеле *«Імі ганарыцца ўніверсітэт»*.

* * *

НАДЗВЫЧАЙНЫ і Паўнамоцны Пасол Індыі ў Рэспубліцы Беларусь Манодж Кумар Бхарці 16 лютага выступіў у Беларускім дзяржаўным універсітэце з лекцыяй на тэму «Мінулае. Сучаснасць. Будучыня». На яе былі запрошаны студэнты і выкладчыкі факультэтаў: міжнародных адносін, эканамічнага, гістарычнага, механіка-матэматычнага, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, а таксама Інстытута журналістыкі БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АКТУАЛЬНА

***Міжнародны дзень роднай мовы 21 лютага ў БДУ адзначылі з вялікім размахам. Найбольш насычаныя мерапрыемствы, як звычайна, адбыліся на філалагічным факультэце і ў Інстытуце журналістыкі, але сёлета яны выйшлі і на ўзровень агульнаўніверсітэцкіх. Усім супрацоўнікам і студэнтам было прапанавана ў гэты дзень размаўляць па-беларуску. Выкладчыкі філфака правялі лекцыі-гутаркі на тэму «Беларуская мова як неацэнны скарб народа» на 12 факультэтах.***

# НЕАЦЭННЫ СКАРБ НАРОДА

***На філалагічным факультэце беларускай мове традыцыйна прысвячаецца цэлы тыдзень. Гэта заўжды ўнікальная магчымасць як для студэнтаў, так і для выкладчыкаў пагутарыць з выбітнымі асобамі.***

У першы дзень Тыдня беларускай мовы факультэт наведалі *Навум Гальпяровіч і Адам Мальдзіс*. Навум Якаўлевіч – беларускі паэт, журналіст, галоўны дырэктар замежнага вяшчання Беларускага радыё – адзначыў, што «павінна быць 365 дзён роднай мовы, а не адзін дзень... Нам трэба браць прыклад з замежнікаў, як цаніць сваю мову і культуру». Для арганізатараў праваслаўнага радыё «Артадоксія» ў Беластоку «беларуская мова – гэта Паходня, гэта сімвал». Нават «Міжнароднае радыё Кітая» зладзіла перадачу на беларускай мове для беларусаў, якія там жывуць. Гэтую думку падтрымаў і Адам Мальдзіс – пісьменнік, літаратуразнаўца, гісторык, ганаровы старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, які заўважыў, што «ці ў сваёй краіне, ці за мяжой беларус не павінен забывацца на сваю мову і культуру». Адам Восіпавіч расказаў пра страчаную спадчыну беларусаў і святыні, якія зараз знаходзяцца за межамі нашай краіны.

У «афіцыйны» дзень, 21 лютага, на філфак завіталі міністр адукацыі Беларусі *Сяргей Маскевіч*, рэктар БДУ адэмік *Сяргей Абламейка*, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАНБ *Аляксандр Лукашанец* і аўтар дзяржаўнага гімна нашай краіны *Уладзімір Карызна*. Дэкан філалагічнага факультэта прафесар *Іван Роўда* на правах гаспадара ўзяў слова першым і заклікаў сучасную моладзь гаварыць на роднай мове, любіць яе і шанаваць, пісаць вершы і раманы на ёй, прызнавацца ў каханні, бо «чым больш мы будзем ёй карыстацца, тым больш яна будзе раскрываць нам свае таямніцы». Міністр адукацыі ў сваю чаргу лічыць, што неабходна пашырыць колькасць прадметаў, якія выкладаюцца на беларускай мове, працягваць традыцыі Якуба Коласа, Івана Навуменкі, Ніла Гілевіча – выкладчыкаў БДУ і народных пісьменнікаў Беларусі. «Родная мова для кожнага з нас – гэта сімвал. Наша задача – шанаваць і развіваць родную мову», – адзначыў ён і паабяцаў у бліжэйшы час разам з кіраўніцтвам абмеркаваць пытанні развіцця мовы ва ўніверсітэце. Яго падтрымаў і рэктар БДУ Сяргей Абламейка: «Трэба ведаць, хто мы і адкуль мы, і наш абавязак – шанаваць родную мову і спрыяць ёй». Па словах Аляксандра Лукашанца, «наша мова – гэта высокаразвітая мова, на якой можна весці ўсе зносіны. Не хапае толькі кансалідаванай волі грамадства яе падтрымліваць... У XXI ст. мова павінна быць не модай, а паўсядзённым адзеннем». Для гасцей студэнты філфака на шматлікіх мовах прачыталі вершы і праспявалі народныя песні.



*Сяргей Маскевіч: «Наша задача – шанаваць і развіваць родную мову!»*

22 лютага сярод студэнтаў першага курса было праведзена інтэлектуальна-забаўляльнае спаборніцтва пад назвай «Філалогія і я», дзе яны ў розных конкурсах праяўлялі свае разумовыя і артыстычныя здольнасці. Студэнты надзвычай стараліся, складалі вельмі цікавыя аповеды, у якіх усе словы пачыналіся з адной толькі літары «Н», ствaралі вершы, давалі неверагодныя адказы. Так, адна канкурсантка закончыла вядомы фразеалагізм такім чынам: «Баба з возу – каню свята» (у арыгінале «Баба з возу – каню лягчэй»).

23 лютага адбылося цёплае спатканне з бліскучым знаўцам беларускай мовы, галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі, доктарам філалагічных навук, акадэмікам Міжнароднай акадэміі Еўразіі, доктарам honoris causa Сафійскага ўніверсітэта, членам Міжнароднага камітэта славістаў *Генадзем Цыхуном*. Славутаму мовазнаўцу прыйшлі падзякаваць яго шматлікія вучні. Прыемным сюрпрызам для самога Генадзя Апанасавіча і для астатніх была выдадзеная кніга ў серыі «Моваведы Беларусі» з выбранымі працамі Генадзя Цыхуна. Для яго мова несумненна атаясамліваецца з нацыяй. На пытанне «Ці адметная наша мова?» ён адказаў: «Кожны чалавек адметны, а народ тым больш. І мова адметная. Бо кожная фарміруецца ў сваім асяроддзі, у сваіх кантактах».

Апошні дзень быў прысвечаны вельмі важнаму перакладу Святога Пісання на беларускую мову. У дыскусіі браў удзел старшыня Камісіі па перакладзе літургічных тэкстаў і рэлігійнай літаратуры, суаўтар слоўніка беларускай мовы і энцыклапедычнага слоўніка рэлігійнай лексікі беларускай мовы, магістр тэалогіі *Уладзіслаў Завальнюк*. Пераклады Святога Пісання граюць вызначальную ролю ў развіцці кожнай нацыянальнай мовы, бо спрыяюць прызнанню, сцвярджэнню яе ў якасці надпобытавай, наддыялектнай, надканфесійнай. Перакладаў Святога Пісання ў нас зроблена нямала, вось толькі яны пакуль не могуць у поўнай меры задаволіць беларусаў.

Мова – гэта надзвычай жывая і складаная сістэма. Для яе развіцця, а ў нашым выпадку і захавання, павінен зрабіць уклад кожны неабыякавы да свайго лёсу беларус. Толькі ўласная пазіцыя кожнага здолее ператварыць адзін дзень роднай мовы ў год мовы, а затым гады, і нарэшце жыццё мовы. А пакуль гэты нялёгкі і адказны шлях да яе жыцця мы пачынаем з Тыдня роднай мовы з надзеяй і верай у яго штогадовае пашырэнне.

**Сяргей САМАХВАЛ**

# Абдымі мяне па-беларуску

***Тыдзень беларускай мовы Інстытут журналістыкі святкаваў упершыню. Разнастайнасць імпрэз нагадала, што беларуская мова можа аднолькава добра слугаваць навуковай супольнасці на канферэнцыі, маладзёнам на танцах, журналістам у пошуках працы, пісьменнікам у іх даследаваннях чалавечай натуры і ўдзельнікам гульні ў «Мафію» пры пошуках Хроснага бацькі. Ці сапраўды беларуская мова ўсеабдымная, як абвяшчалі слоганы і дэматыватары на працягу тыдня, распытваем арганізатараў свята.***

## ВЕСЕЛА І НЯЗМУШАНА

Святлана Ісаёнак, Ганна Кузьмінова, Андрэй Карэлін і Максім Зайцаў утвараюць ядро студэнцкай каманды, якая летась правяла святкаванне Дня роднай мовы на журфаку і здолела гэтым годам не толькі не згубіць, але і акумуляваць імпэт і здольнасць да яркіх прыдумак, а таксама арганізаваць вакол сябе аднадумцаў з малодшых курсаў. Як студэнты прыйшлі да Дня роднай мовы, згадвае Ганна Кузьмінова: «Усё пачалося даволі выпадкова, бадай што з бухты-барахты. Хтосьці з нас прачытаў, што такі дзень існуе, вырашылі зладзіць свята і ў нас, закінулі абвестку ў інтэрнэт, маўляў, хто хоча – далучайцеся. З тымі, хто адгукнуўся, сабраліся ў кавярні і там, за кубачкам гарбаты, дагаварыліся да таго, што будзем запрашаць на наша свята міністра адукацыі, міністра культуры – замахнуліся на вельмі высокі ўзровень і досыць сур'ёзны фармат. І хоць не ўсё ўдалося рэалізаваць напоўніцу, свята атрымалася добрае. Можа, таму сёлета кіраўніцтва факультэта і ўніверсітэта нас так падтрымала: калі мы прыйшлі з прапановамі імпрэз, нам у сваю чаргу прапанавалі святкаваць не адзін дзень, а цэлы тыдзень, дапамаглі з друкам афіш і промамерапрыемствамі. Нам хацелася зрабіць падзеі, цікавыя найперш для студэнтаў, каб шмат людзей захацела прыйсці, самахоць уключыцца ў святочныя дзеі і размаўляць па-беларуску. Тым годам узялі на ўзбраенне слоган «Мова родная – мова модная», ладзілі паказ сучасных нацыянальных строяў, бо рупіла, каб мова перастала асацыявацца толькі з чымсьці сялянскім і фальклорным, каб людзі пабачылі, што яна можа быць актуальнай. Месяц таму, калі думалі, праз што можа весела і нязмушана перадавацца беларуская мова, мы прыйшлі да ідэі free-hugs, бясплатных абдымкаў, якія нясуць людзям радасць, і прызначылі адпаведны флэш-моб на раніцу Дня роднай мовы. Затым, калі трэба было аб'яднаць усе разнародныя мерапрыемствы запланаванага тыдня – важную канферэнцыю памяці нашага шаноўнага прафесара Цікоцкага, дэбаты студэнтаў і выкладчыкаў, алімпіяду, сустрэчы з пісьменнікамі, майстар-класы і шэраг забаўляльных імпрэз, як танцы, спевы, гульні – знайшоўся слоган «Беларуская мова – усеабдымная, бо мова ахоплівае ўсё».

## «Я С ВАС ПОРЖАЛ»

Студэнцкая ініцыятыва знайшла водгук сярод выкладчыкаў, якія ахвотна бралі ўдзел у захапляльных дзеях. Істотную падтрымку ў арганізацыі аказвала Аксана Бязлепкіна, дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі: «У гэтым годзе хацелася як мага далей адысці ад шаблонаў святкавання Дня роднай мовы. Па-першае, захапіць увагу тых, хто, можа, не вельмі добра размаўляе па-беларуску або і зусім мовы не ведае. Так, у нас быў майстар-клас «Як пачаць размаўляць па-беларуску штодня», і давалі яго людзі, якія звычайна карыстаюцца беларускай мовай, хаця іх праца з ёй не звязана. Быў, напрыклад, дырэктар лагістычнай фірмы, які распавёў студэнтам пра цяжкасці беларускамоўнага вядзення бізнесу. Падругое, імкнуліся пазбегнуць пафасу, бо ён нікога яшчэ не пераканаў змяніць мову (а мы якраз у сітуацыі, калі трэба паспрабаваць пераканаць). Таму вырашылі рабіць па-беларуску тое, што мы і так робім: вітацца і абдымацца, гуляць разам у псіхалагічную гульню «Мафія» (на журфаку гэта ўжо амаль будзённасць, праводзіўся Кубак факультэта па «Мафіі»). Дадаём да звыклых і любімых рэчаў беларускую мову, і гэтыя рэчы працуюць як ліфт, што падымае беларускасць у самую свядомасць удзельнікаў свята. Па-трэцяе, хацелася максімальна ўцягнуць людзей у дзеянне, таму ў многіх імпрэзах цікавей было ўдзельнічаць, чым глядзець збоку – напрыклад, танчыць падыспань і кракавяк зусім не складана і вельмі весела, дый нават у простым карагодзе-«бочцы» кожны мог адчуць сваю далучанасць. На гэта ж быў скіраваны і конкурс дэматыватараў, забаўных карцінак з трапнымі подпісамі, якія распаўсюджваліся ў сацыяльных сетках – каб студэнты захацелі пажартаваць па-беларуску, каб фразы з гэтых дэматыватараў пайшлі ў народ (а гэта ж беларускія фразы)... Збянтэжыла іншае. Сярод моладзі шмат людзей не тое каб рускіх, а, так бы мовіць, без нацыянальнай прыналежнасці – яны не выхаваны ў рэчышчы якойсьці пэўнай культуры, гэткія постнацыянальныя людзі. І вось падчас нашага шумнага свята, калі было бачна, што адбываецца нешта неверагоднае, прытым неверагодна душэўнае, гэтыя людзі раптам адчулі сваю недалучанасць. Ім ніхто не забараняў далучыцца – яны самі сабе прыдумалі, што гэта не іх свята. У твітары з'явіўся допіс спадара Дзяніса Блішча, памойму: «Люди, поговорившие один день по-белорусски, я с вас поржал». Менавіта «с вас», руская калька да беларускага «кпіць, смяяцца з кагосьці». Нават адзін дзень робіць велізарны ўплыў на студэнтаў. Часам дастаткова адной фразы, каб нешта змяніць у сваім жыцці. А тут цэлы дзень, цэлы тыдзень, калі табе добра і весела. Гэта запомніцца.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

УСТАНОВЫ

# На парозе новых здзяйсненняў

***Вучэбна-навуковы цэнтр па нанаматэрыялах і нанатэхналогіях з'явіўся ў БДУ. Яго каардынатар кандыдат фізіка-матэматычных навук Віталь КСЯНЕВІЧ расказаў нам пра новую структуру.***

Цэнтр створаны на базе падраздзяленняў універсітэта, якія і раней займаліся даследаваннямі або падрыхтоўкай спецыялістаў у галіне нанапамерных сістэм. На думку Віталя Казіміравіча, «прыйшоў час аб'яднаць іх намаганні ў гэтым напрамку». Часам можна назіраць, як структурныя падраздзяленні БДУ, якія займаюцца даследаваннямі ў галіне нанапамерных сістэм, з поспехам супрацоўнічаюць з замежнымі навуковымі арганізацыямі, але пра напрацоўкі адзін аднаго не ведаюць, – расказвае кіраўнік цэнтра. – Пры гэтым многія навуковыя тэмы, накіраваныя на вывучэнне нанапамерных сістэм, патрабуюць міждысцыплінарных ведаў і для свайго выканання прадугледжваюць стварэнне камандаў спецыялістаў розных факультэтаў і інстытутаў. Цяпер з'явілася магчымасць больш цеснага ўзаемадзеяння розных лабараторый пры правядзенні даследаванняў у гэтай галіне навуковых ведаў». Галоўным навуковым інтарэсам самога Віталя Ксяневіча з'яўляецца фізіка нізкапамерных і мезаскапічных сістэм. Пры гэтым ён узначальвае НДЛ фізікі электронных матэрыялаў пры кафедры фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі фізічнага факультэта.

Невыпадкова цэнтр па нанаматэрыялах і нанатэхналогіях створаны пры фізічным факультэце. Менавіта тут у 9-ці навукова-даследчых лабараторыях выконваецца большасць прац у сферы нанаматэрыялаў, нана- і біятэхналогій ва ўніверсітэце. Каштоўнае абсталяванне таксама сканцэнтравана ў асноўным на фізфаку. У мінулым годзе, напрыклад, фізікі атрымалі ўнікальны спектрометр для раманаўскага і люмінесцэнтнага аналізу нана- і мікрапамерных структур. Сёлета БДУ вядзе перамовы з японскай кампаніяй на пастаўку сістэмы ахаладжэння для правядзення вымярэнняў раманаўскіх і люмінесцэнтных спектраў у шырокім дыяпазоне тэмператур.

Дарэчы, фізічны факультэт адным з першых адкрыў і новы напрамак па падрыхтоўцы спецыялістаў – фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій. У мінулым годзе на спецыялізацыі нанафатоніка, нанаэлектроніка, нанабіяматэрыялы і нанабіятэхналогіі, функцыянальныя нанаматэрыялы былі набраны першыя 30 студэнтаў. Такім чынам, у распрацоўцы метадалагічнага суправаджэння, выкладанні пэўных дысцыплін фізічны факультэт таксама мае патрэбны вопыт, які можа быць цікавы для калег. Функцыянаванне цэнтра толькі дапаможа скаардынаваць працу з факультэтамі і НДІ пры падрыхтоўцы дыпламаваных спецыялістаў і магістраў у вышэйпералічаных галінах. Акрамя таго, на базе цэнтра будзе ажыццяўляцца распрацоўка спецыялізаваных і міждысцыплінарных вучэбна-метадычных матэрыялаў, курсаў лекцый, лабараторных работ для забеспячэння навучальнага працэсу на профільных факультэтах БДУ.

Новая структура будзе праводзіць навукова-метадычныя семінары, канферэнцыі і такім чынам знаёміць навуковую супольнасць універсітэта з найноўшымі сусветнымі дасягненнямі. Пільная ўвага будзе надавацца і ўдзелу ў міжнародных навуковых праграмах.

**Ганна ЛАГУН**

# Абвяшчаецца конкурс на суісканне прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі ў 2012 годзе

***Конкурс на суісканне прэмій у галіне сацыяльных і гуманітарных навук імя У. І. Пічэты і ў галіне прыродазнаўчых навук А. Н. Сеўчанкі абвешчаны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Ён будзе праходзіць з сакавіка па верасень бягучага года ў намінацыі «Адукацыя».***

Прэміі прысуджаюцца навукоўцам і дадаткова на агульных падставах маладым навукоўцам (дактарам навук ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдатам навук – да 35 гадоў, навукоўцам без ступені – да 30 гадоў) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта за выдатныя дасягненні, якія ўключаюць: распрацоўку новых адукацыйных тэхналогій, істотна павышаюць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў; стварэнне падручнікаў, навучальных дапаможнікаў і навучальнага абсталявання.

Дакументы падаюцца ў НДЧ–ГУН БДУ да **30 красавіка 2012 года**. Падрыхтаваныя матэрыялы прымаюцца па адрасе: вул. Бабруйская, 9, к. 401 (аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі).

На конкурс прадстаўляюцца калектыўныя працы і працы асобных аўтараў. Колькасць суаўтараў не можа быць большай за чатыры чалавекі.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць у аддзеле навукова-тэхнічнай інфармацыі па тэл. 209-53-92. Электронныя варыянты дакументаў размешчаны ў агульных папках на серверы БДУ *(Microsoft Outlook): «Агульныя папкі» / «Усе агульныя папкі» / «Навукова-даследчая частка–Галоўнае ўпраўленне навукі» / «Конкурс У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі»*.

**НДЧ–ГУН БДУ**

ВЫСТАВЫ

# Адукацыя і кар'ера

***Адукацыйная дзейнасць Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта была прадстаўлена на 10-й спецыялізаванай выставе «Адукацыя і кар'ера». Яна прайшла з 23 па 25 лютага ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі.***

У межах выставы зладжаны два семінары для абітурыентаў і іх бацькоў. Адзін з іх прысвечаны IT, матэматычным і прыродазнаўчым спецыяльнасцям БДУ і прайшоў 23 лютага, а другі – сацыяльна-эканамічным і гуманітарным спецыяльнасцям – 24 лютага. На семінарах былі прэзентаваныя і новыя спецыяльнасці, адкрытыя ў БДУ, праведзены кансультацыі па пытаннях уступнай і прыёмнай кампаніі ў 2012 годзе. Акрамя таго, усе ахвотныя змаглі атрымаць поўную інфармацыю па перападрыхтоўцы ў БДУ і курсах павышэння кваліфікацыі.

Таксама Інстытут бесперапыннай адукацыі БДУ правёў прэзентацыю праграм па рабоце з адоранымі дзецьмі і падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання.

**Паводле інфармацыі ГУВНМР**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, філасофіі і метадалогіі навукі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: менеджменту, эканамічнай тэорыі, гісторыі новага і найноўшага часу, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, міжнародных эканамічных адносін, раманскіх моў, філасофіі культуры;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, філасофіі культуры, філасофіі і метадалогіі навукі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

Дацэнта кафедры прававых дысцыплін (1)

Дацэнта кафедры эканомікі і кіравання бізнесам (2)

Старшага выкладчыка кафедры кіравання маёмасцю (1)

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, ДІКСТ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.*

**ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР СЛУХАЧОЎ НА ПРАГРАМУ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ «ІНАВАЦЫЙНЫ МЕНЕДЖМЕНТ».**

Запрашаюцца асобы з вышэйшай адукацыяй і студэнты 4-5 курсаў.

Пры паспяховым заканчэнні навучання выдаецца дыплом дзяржаўнага ўзору аб перападрыхтоўцы з прысваеннем кваліфікацыі «менеджар-эканаміст».

Студэнтам БДУ прадугледжаны зніжкі.

*Дакументы прымаюцца па адрасе: Мінск, вул. Кальварыйская, 9, офіс 25 (8-мы паверх).*

*Тэлефоны*
*+ 375 (17) 259-70-78,*
*+ 375 (29) 169-62-00.*

*Дакументы прымаюцца да 1 сакавіка 2012 года.*

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

***Шаноўныя калегі!***

***Ад сябе асабіста і ад усяго шматтысячнага калектыву Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сардэчна віншую вас з юбілеем.***

***Мы ад усёй душы рады пажадаць вам добрага здароўя, уласнага шчасця, шмат гадоў натхнёнай працы на карысць нашага ўніверсітэта.***

***Рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка***

*1 сакавіка*

Кірычэнка Арына Уладзіміраўна, дацэнт кафедры класічнай філалогіі

Шаўчук Цімур Аркадзьевіч, дацэнт кафедры арганічнай хіміі

*9 сакавіка*

Мядзведзева Ірына Аляксееўна, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі

*11 сакавіка*

Касцюк Уладзімір Андрэевіч, загадчык навукова-даследчай лабараторыі фізіялогіі

*12 сакавіка*

Гілеўскі Станіслаў Вікенцьевіч, дацэнт кафедры сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання

*13 сакавіка*

Капашова Ірына Міхайлаўна, дацэнт кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій

*15 сакавіка*

Панарадаў Уладзімір Васільевіч, прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях

Сяцко Ігар Пятровіч, загадчык НДЛ інфармацыйна-вымяральных сістэм кафедры інфарматыкі і камп'ютарных сістэм

*18 сакавіка*

Кабо Андрэй Генадзьевіч, старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчай лабараторыі фізічнай хіміі кандэнсаваных асяроддзяў

*23 сакавіка*

Кандруцкі Юрый Уладзіміравіч, дырэктар РВУП «Камбінат грамадскага харчавання БДУ»

*24 сакавіка*

Новікава Кацярына Віктараўна, дацэнт кафедры крымінальнага права

*27 сакавіка*

Чурбакоў Юрый Дзмітрыевіч, дацэнт кафедры геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі

*28 сакавіка*

Сыкала Аляксандр Іванавіч, дацэнт кафедры агульнай і клінічнай псіхалогіі

*Спіс усіх імяніннікаў размешчаны на сайце БДУ www.bsu.by ў раздзеле «Нашы юбіляры».*

**Паводле інфармацыі ўпраўлення кадраў БДУ**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Каментар рэктара БДУ Сяргея Абламейкі наконт заканчэння будаўніцтва новага будынка ФМА БДУ** – БелТА, tut.by, АНТ, ont.by, generation.by, sb.by, open.by, date.bs (22.02), «Рэспубліка», respublika.info (23.02); «Знамя юности» (24.02).

**Вынікі зімовай сесіі ў БДУ** – Інтэрфакс (23.02).

**Гутарка з першым прарэктарам БДУ Міхаілам Жураўковым** – «Минский курьер», mk.by (14.02), «Вячэрні Мінск» (23.02).

**Да 90-годдзя прафесара БДУ Міхаіла Цікоцкага** – «Звязда», zvyazda.minsk.by, nn.by (21.02).

**Навучанне ў БДУ замежных грамадзян** – tut.by (17.02).

**Падпісанне дамовы аб супрацоўніцтве паміж БДУ, прадпрыемствам «ЛОТІС ТІІ» і кампаніяй Tokyo Instruments, Inc.** – «Минск-новости» (17.02); БелТА, 21.by, tut.by (21.02).

**Выстава-кірмаш «Каменная казка»** – «Минск-новости», БелТА, 21.by (17.02).

**Зімовая школа студэнцкай журналістыкі** – БелТА, 21.by (16.02), АНТ, ont.by (18.02), «Минск-новости» (20.02).

**Стварэнне ў БДУ вучэбна-навуковага цэнтра па нанаматэрыялах і нанатэхналогіях** – БелТА, tut.by, 21.by (10.02); «Минск-новости» (16.02); «Настаўніцкая газета» (21.02).

**Новыя цэны на навучанне** – Інтэрфакс (10.02); «Звязда», zvyazda.minsk.by (11.02); date.bs (12.02, 17.02); kp.by, (17.02), tut.by (18.02).

**Матэрыялы з прафесарскага сходу** – «Минск-новости» (08.02); БелаПАН, naviny.by, 21.by, date.bs (09.02), АТН, tvr.by (12.02), «Веды» (13.02).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# «Зімовая школа» для гарачых сэрцаў

***З 17 па 19 лютага ў САК «Брыганціна» праводзіўся Рэспубліканскі семінар-практыкум «Зімовая школа студэнцкай журналістыкі». Каля 150 студэнтаў з 39 ВНУ краіны абменьваліся вопытам і бралі ўрокі майстэрства ў масцітых выкладчыкаў.***

«Брыганціна» прымала зімовых гасцей ужо ў пяты раз. Вельмі шмат дзяцей тут не ўпершыню, а гэта доказвае, што школа не страчвае сваёй актуальнасці. Аднаго пазірку на праграму мерапрыемстваў хапае, каб зразумець: арганізатары не дадуць змерзнуць. Як толькі гукі нашых галасоў запоўнілі жылыя карпусы, пачалося супрацьстаянне камандаў. Удзельнікаў размеркавалі такім чынам, каб у адной групе сустрэліся незнаёмыя людзі. У выніку атрымаліся зборныя каманды, геаграфія якіх ахоплівае ўсю Беларусь.

Літаральна адразу пасля адкрыцця «Зімовай школы» вока стала натыкацца на стыкеры з усмешкамі. Гэта пра пачатак сваёй піяр-кампаніі заявіла каманда Smile. На працягу дня ўсміхацца сталі ўсе сцены «Брыганціны», а таксама і людзі, якія прынялі ўдзел у падрыхтоўцы промароліка гэтай пазітыўнай каманды. Дарэчы, ён з'явіўся раней за ролікі супернікаў, што з самага пачатку дало яму фору. Але астатнія каманды таксама не сядзелі на месцы. F1 пачаставалі смачна есці кожнай групе на розных мовах. Потым у гульню ўключыліся хлопцы са «Што трэба», і сцены апанавала назва каманды ў розных выявах. Найбольшай папулярнасцю карысталіся ўлёткі з дзяўчатамі, пры адным поглядзе на якіх так і хацелася сказаць «Што трэба!». Самая паветраная каманда O2 паабяцала перакрыць доступ «сябе» іншым удзельнікам, і на вуліцах сталі з'яўляцца ўлёткі з папярэджаннямі пра малы запас кіслароду. Яго колькасць разлічана толькі на два дні, гаварылася ва ўлётках. Гэта значыць менавіта на час школы.

Каманды, дарэчы, усё ж такі скарысталіся гэтай парадай і шчасліва пакінулі карпусы ў прызначаны тэрмін. Але пра гэта далей. Заявілі пра сябе таксама «Усе свае» і «Хурма», якая хутка праславілася дзякуючы надпісам на снезе, зробленымі падфарбаванай вадой. Глядзелася настолькі ярка і эфектна, што амаль адразу ж у суседстве з садавіной пасяліліся чалавечкі-сімвалы ад «Усіх сваіх». Да сярэдзіны другога дня запрацавала і «Кухня». Хлопцы ў сваёй рэкламе паведамілі, што яны спецыялізуюцца на ламанні стэрэатыпаў і навінах «з перчыкам».

У перапынках паміж спамам і гарбатай каманды наведвалі секцыі, арганізаваныя Інстытутам журналістыкі, псіхалагічнай службай БДУ і дзеячамі культуры. Мы вучыліся працаваць у камандзе, кіраваць размовай, вытрымліваць стылістычнае адзінства матэрыялу і многаму іншаму. Часам вялася вельмі сур'ёзная размова, але тым не менш таксама займальная. Секцыі чымсьці нагадвалі школьныя ўрокі, але заняткі амаль не ўтрымлівалі тэорыі, а былі накіраваны на саму працу. Семінар-практыкум наведалі міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч і рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка.

На прэс-канферэнцыі госці з разуменнем паставіліся да агучаных праблем і паабяцалі прыкласці намаганні для іх вырашэння. У прыватнасці, было закранута пытанне прывязкі кошту інтэрната да базавай велічыні. Дыялог вёўся ў форме, блізкай да моладзі, таму міністр адказаў проста: «Адвяжам!» Таксама ён паабяцаў, што кошт навучання ў гэтым навучальным годзе павышацца больш не будзе. Балонскі працэс, падтрымка маладзевых ініцыятыў і нават перспектыва выкладання школьнага курса гісторыі на беларускай мове – гэтыя і мноства іншых пытанняў былі абмеркаваны ў рамках канферэнцыі. Дарэчы, маладыя журналісты настолькі засыпалі гасцей пытаннямі, што затрымаліся больш як на гадзіну.

Зрэшты, гэта не дзіўна. Практычна на ўсіх лекцыях нам нагадвалі, што галоўная якасць майстра пяра – цікаўнасць. Не менш цікавыя


Фота Настассі ХРАЛОВІЧ

*Каманда Smile разам са старшынёй экспертнай камісіі Аляксандрам Градзюшкам*

госці чакалі і на майстар-класах. Прадстаўнікі інтэрнэт-парталаў (Марына Золатава, Дзяніс Блішч), тэлебачання (Людміла Васілевіч, Алег Раманаў і інш.), радыё (Ганна Гардзеева, Павел Лазовік) і друкаваных СМІ (Вікторыя Цярашонак) распавялі пра асновы сваёй прафесіі і апісалі цікавыя выпадкі. Было вельмі прыемна слухаць вопытных калег, бо адна справа – асвойваць тэорыю, а іншая – пагутарыць з прадстаўнікамі рамяства. Сустрэча пакінула прыемнае ўражанне. Але нешта наогул незвычайнае пачалося пасля вячэры. Па «Брыганціне» пайшла пагалоска, быццам у сувязі з 200-годдзем заканчэння вайны з Напалеонам успплылі звесткі пра закапанае золата.

Прага нажывы і бяздзейная цікаўнасць прымусілі журналістаў, якія ўявілі сябе скарбашукальнікамі, выправіцца на пошукі. За час вар'яцкай гонкі ім сустрэліся персанажы ад бабак з семкамі да самога Напалеона. Пазней стала вядома, што ў гісторыі мела месца нават «забойства». Гэтыя падзеі сталі асновай для наступных арыгінальных загалоўкаў. Дарэчы, пра загалоўкі. Па правілах школы, кожная каманда абавязана прадставіць сваю газету і паспрабаваць пераплюнуць супернікаў у крэатыве і метадах працы. Як выявілася на практыцы, збіраць даныя, фіксаваць на фота, быць у курсе ўсіх падзей і паспець зрабіць газету за адну ноч... рэальна! Каб прапіярыць сваё выданне, каманда «Што трэба», напрыклад, размясціла сцяг са сваёй эмблемай на пажарнай лесвіцы сталовай. Аднак вораг не дрэмле, і праз дзве гадзіны палатно знікае з усеагульнага агляду. Тады «штотрэбаўцы» паднялі праблему нізкай тэмпературы.

Плакат са словамі «Ацяпленне ШТО ТРЭБА» быў размешчаны проста над уваходам у адзін з карпусоў. Зразумела, актуальнасць паднятай праблемы не магла не прыцягнуць увагі, і арганізатары... сфатаграфаваліся каля плаката. Якія толькі метады каманды не апрабавалі для прасоўвання сваёй маркі! У ходзе сталовай усіх частавалі цукеркамі (тут ужо справа густу – у камандаў былі прысмакі з рознымі начынкамі), а раніцай там жа з'явіўся новы сімвал школы – Брыгамен, які трымае ў руках зімовае сонца. Пра радзіму гэтага персанажа нескладана здагадацца, бо «Зімовае сонца «Брыганціны» – газета самай усмешлівай каманды – Smile. Менавіта яны сталі прызнанымі лідарамі, перамогшы ў конкурсе газет і лепш за астатніх сябе прарэкламаваўшы. Акрамя таго, на цырымоніі закрыцця былі ўзнагароджаны найлепшыя выданні ў розных намінацыях. А выніку фотамарафону падвёў фатограф Юрый Іваноў.

Дыпломы знайшлі сваіх уладальнікаў, і ўдзельнікі «Зімовай школы студэнцкай журналістыкі» адправіліся збіраць рэчы. Усё ж такі вельмі сумна з'язджаць з месца, дзе за такі кароткі тэрмін удалося перажыць столькі радасных момантаў. Але студэнты-журналісты не сумуюць. Часцей яны выкарыстоўваюць дэвіз пераможцаў-«смайлаў»: «Пасміхаемся і махаем!» Пасміхаемся і махаем, сябры, бо праз два гады мы зноў зможам сабрацца і адчуць усю красу працы са словам. Да новых сустрэч, «Брыганціна»!

**Марына СІМАНАВА**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# CanSat – спадарожнік у бляшанцы

***Каманда ліцэя БДУ выйшла ў фінал першага чэмпіянату CanSat у Расіі. Адборачная сесія спаборніцтваў, прымеркаваных да юбілейных знамянальных падзей у галіне касманаўтыкі, прайшла 28–29 студзеня ў Мемарыяльным музеі касманаўтыкі і НДІ ядзернай фізікі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава.***

Чэмпіянат CanSat – гэта маладзевая творчасць па распрацоўцы і стварэнні адукацыйных спадарожнікаў, усе асноўныя сістэмы якіх павінны змясціцца ў бляшанку з-пад газаванага напою аб'ёмам 0,33 літра (CanSat – ад англ. Satellite in a can – спадарожнік у бляшанцы). Распрацаваная школьнікамі прылада закідваецца ракетай на вышыню да 2 км і падчас кіраванага спуску на парашуце павінна выканаць навуковую праграму і перадаць інфармацыю па радыёканале на Зямлю.

Падобныя чэмпіянаты ўжо даўно праводзяцца ў ЗША, Японіі, Нідэрландах, Нарвегіі і іншых краінах. Іх мэта – далучыць школьнікаў да праектаў, звязаных з тэхналогіямі і праектаваннем.

У складзе каманды ліцэя БДУ, якая прадстаўляе на расійскім чэмпіянаце Беларусь, чатыры хлопцы і дзяўчына: Яўген Новікаў, Андрэй Горбач, Яўген Алейнік, Аляксандр Зайцаў і Юлія Выхота – усе яны вучацца ў 10/11 класах фізіка-матэматычнага профілю. Працай над сваім спадарожнікам яны займаюцца на факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ пад патранажам студэнтаў факультэта.

Арганізатары конкурсу загадзя далі ўдзельнікам базавы канструктар, які складаецца з мікракантролера, тэрмадатчыка, датчыка ціску і платы радыёмодуля. Задача была ў тым, каб сабраць спадарожнік і ўсталяваць на ім іншыя арыгінальныя вузлы і прыборы, якія дазваляюць выканаць шэраг дадатковых навуковых задач. Падчас адборачнай сесіі, для ўдзелу ў якой былі заяўлены 30 камандаў, навучэнцы павінны былі прэзентаваць мадэль спадарожніка і абараніць свой праект, распавёўшы арганізатарам пра ўжо праведзеную працу. Для абароны беларускага праекта ў Маскву адправіліся Андрэй Горбач і капітан каманды ліцэіста Яўген Новікаў.



«Апроч прысутных у базавым канструктары спадарожніка датчыкаў тэмпературы і ціску, наша каманда забяспечыла сваю прыладу датчыкам вуглякіслага газу, які дазволіць вымяраць забруджанасць паветра ў воблаці запуску, а таксама трыма фотадыёдамі для пошуку пажараў, – распавёў Яўген Новікаў. – У адрозненне ад большасці камандаў на чэмпіянаце, мы паспелі вельмі многае. Мы практычна цалкам напісалі праграмнае забеспячэнне для ўсіх датчыкаў, уключаючы дадатковы датчык вуглякіслага газу, а таксама замацавалі ўсе датчыкі і платы на каркасе. Многія каманды не толькі не паспелі зрабіць гэтага – яны нават не ўяўлялі, якім чынам гэта трэба рабіць. Для таго, каб працаваць над стварэннем спадарожніка, недастаткова ведаў толькі па фізіцы – патрэбныя яшчэ веды па інфарматыцы, хіміі, экалогіі, 3D-мадэляванні, урэшце, неабходна проста ўмець паяць».

Па выніках першага этапу спаборніцтваў арганізатары адабралі 17 камандаў, якія запусцяць свае спадарожнікі на палігоне ў Калузе ў траўні гэтага года.

**Таццяна БАБУШКІНА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

29 лютага 2012 года
Падпісана да друку 27.02.2012 г.
Зак. . Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by